**Роліч Л.В.,** студ. 413 гр.

Навуковы кіраўнік – Аждер Н.А.

# СУЧАСНЫ ГАБЕЛЕН: ТРАДЫЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

Дакладна назваць кропку на стужцы часу, тую кропку з якой пачалася гісторыя беларускага габелена, напэўна немагчыма. Але вядома, што шпалернае ткацтва, так як і шмат іншых рэчаў, з'явілася на нашай зямлі дзякуючы Радзівілам дзесці ў XVIII ст. Мінула не адно стагоддзе, ні адзін заняпад і адраджэнне, праз якія шпалера крочыла да сучаснасці.

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі надзвычай разнапланавае. Яно ўключае розныя віды творчасці, якія аб'яднаны аўтэнтычнасцю гучання, моцным эстэтычным уздзеяннем на гледача, што грунтуецца на арганічным выкарыстанні натуральных прыродных матэрыялаў і традыцыйнага дэкору. Менавіта гэта дазваляе творам мастацтва захоўваць самабытнасць і нацыянальны каларыт. Нястрымна вабіць сучасных мастакоў архаіка. Зварот да старажытнага дае мастакам невычэрпныя магчымасці для спалучэння знешняй прастаты, умоўнасці, нават прымітывізму формы з глыбіннай сакральнасцю зместу [2].

Сучасны габелен, як і беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ўвогуле, жывіцца старажытнымі традыцыямі рукатворнага народнага майстэрства. Мастацтва тэкстылю мае свой уласны стыль, які спалучае традыцыі і наватарскія пошукі. Ён пачаў складацца ў 1960-я гг. і працягвае паслядоўна развівацца далей [2]. Класічны габелен, а дакладней шпалера, уяўляе сабой твор мастацкага тэкстылю, выкананы бязворсавым перакрыжаваным перапляценнем, якое дае аднабаковае адлюстраванне матыву або сюжэту ў адвольнай асіметрычнай кампазіцыі. У сучаснасці гэтыя прыкметы класічнага габелена могуць спалучацца з разнастайнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхналагічнымі і пластычнымі новаўвядзеннямі. Тэкстыльным творам неабавязкова захоўваць плоскую прамавугольную форму, яны згінаюцца, умацоўваючыся дадатковым каркасам, прымаюць такім чынам складаныя аб’емна-прасторавыя формы. Уток можа ўтварацца самымі рознымі матэрыяламі: тканіны, скура, папера і нават расліны. У палатно таксама ўключаюцца цвердыя, аб’ёмныя элементы з “іншародных” матэрыялаў, тады яно нагадвае калаж. Габелену надаецца гучанне скульптуры: пры захаванні габеленавага ткацтва кампазіцыйнае рашэнне арыентавана на рэльеф і прастору [1].

Сучаснае дэкаратыўнае мастацтва скіравана на пераадоленне нейтральнасці навакольнага свету. Мастакі цікавяцца не столькі ўтылітарнасцю, колькі асацыятыўнасццю і вобразнасццю. Форма набывае энергічнасць, нярэдка дамінуючую пазіцыю ў творы, і вядзе яго асноўную тэму. У мастацтве тэкстылю сёння ўсе большае распаўсюджанне атрымліваюць тэкстыльныя інсталяцыі, двухмерныя і трохмерныя арт-аб’екты. Назіраецца тэндэнцыя да спалучэння старажытных традыцый ткацтва і вязання, архаічнай сімволікі і архетыпаў з умоўнымі жывапісна-прасторавымі формамі [4].

Выдатныя ўзоры габеленаў беларускіх майстроў былі створаны і ў XX ст. у Гродзенскім абласным цэнтры народнай творчасці ў дзейнічала эксперыментальная ткацкая лабараторыя, дзе па эскізах У. Сухаверхава і І. Давідовіча быў створаны шэраг буйнамаштабных твораў. Габеленнае ткацтва, якое ўзбагацілася народнай закладной тэхнікай, стала своеасаблівай візітнай карткай дэкаратыўнага мастацтва Беларусі і сведчыць пра высокую мастацкую культуру нашай краіны [2].

У 1970 гг. габеленнае ткацтва актыўна развівалася на Барысаўскім камбінаце дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Найбольш вядомы аўтар манументальных габеленных пано, чалавек які імкнуўся адрадзіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва шпалеры – Аляксандр Кішчанка. Для яго работ характэрны імкненне да абагульнення вобразаў праз дакладна выяўленае структураванне і геаметрызацыю форм, схематычнасць малюнка. У 1995 г. мастак стварыў знакаміты «Габелен стагоддзя» (14х19 м), які быў занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса як самы вялікі ў свеце прыклад ручнога ткацтва. Не менш цікавыя габелены Г. Гаркунова, В. Дзёмкінай, Н. Валынец, А. Непачаловіч і іншых барысаўскіх тэкстыльшчыкаў, якім уласцівы пластычная выразнасць і сімвалічная напоўненасць вобразаў. Гэтыя мастакі, якія пакінулі заўважны след у мастацтве габелена, стварылі самыя разнастайныя кампазіцыі, ў тым ліку ўнікальныя велізарныя тканыя заслоны для тэатральных залаў, аналагаў якіх няма за межамі Беларусі. У 2005 г. В. Бартлава і Н. Пілюзіна ў складзе аўтарскага калектыву атрымалі Дзяржаўную прэмію Беларусі за аздабленне інтэр’ераў Палаца Рэспублікі. Манументальныя творы прадстаўлены ў інтэрьерах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Мірскага замка і інш. [2].

Аўтарскі габелен умоўна падзяляецца на выяўленчы і дэкаратыўны. У першым прысутнічаюць усе жанры, сюжэты: фальклорныя, літаратурныя, уласнааўтарскія. Выяўленчы габелен набліжаецца да фігуратыўнага карціннага сказа, або да стылізацыі і абагульнення. У гэтага напрамку належаць творы С. Абрамовіч, Т. Гаўрылавай-Хмызнікавай, Р. Галаватай, І. Данілавай, А. Дваронiна, Г. Лукіной, Н. Пілюзінай, А. Бельцюковай, Л. Пятруль, Г. Гаркуновай, Т. Белавусавай-Пятроўскай і інш. Для другога віду габелена характэрны выразны дэкаратыўны пачатак. Тут пануюць адвольныя тэмы, з разнастайнай пластычнай мовай, кладанай вобразнай структурай, метефарамі, алегорыямі, асаблівай рытмікай. Творы гэтай плыні належаць Л. Густавай, Л. Пятруль, А. Обадавай, Л. Русавай, В. Маркаваец-Бартлавай, М. Шчамялевай і інш. У работах сучаснай творчай моладзі тэкстыльная пластыка напаўняецца аб’ёмам, становіцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трохмернай, убірае ў сябе рысы скульптурнага твора. Гэта і Г. Кліменка, і Х. Высоцкая, і В. Ярэміч, К. Ралінская і М. Барысенка [1].

Актуальнасць мастацкага тэкстылю ў сучасным свеце відавочна. У час, калі аднаўленыя беларускія замкі і будынкі дзяржаўных устаноў аздабляюцца рэканструкцыямі або копіямі старажытных шпалер, ці творамі сучаснага тэкстылю, гэты від мастацтва найлепш адлюстроўвае непаўторнае аблічча беларускай культуры. Развіццё габелена на працягу стагоддзяў вызначалася дваістасцю: гэта глыбока традыцыйны від творчай дзейнасці, які фарміраваўся як мастацтва адначасова дэмакратычнае і арыстакратычнае, манументальнае і ўтылітарнае, прыкладное і разам з тым самадастатковае. Габелен, валодаючы выразнымі выяўленчымі якасцямі, увасабляе мадэль светабудовы цэлых рэгіёнаў ці выяўляе эстэтычныя погляды мастака [3]. Сучасны габелен Беларусі развіваецца ў напрамку трох плыняў: першая − працяг традыцый і развіццё народнага мастацтва, другая – захаванне плоскастнасці з увядзеннем фактуры і іншых матэрыялаў, і яшчэ адна тэндэнцыя – аб'ёмны тэкстыль.

---

1. Беларускі габелен / уклад. Л.І. Пятруль; аўт. уступ. арт. Л.Д. Фінкельштэйн. – Мінск : Беларусь, 2015. – 320 с.

2. Сучаснае беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. XXI стагоддзе = Современное белорусское декоративно-прикладное искусство. XXI век = Modern Belarusian arts and crafts. XXI century: альбом / аўт. тэксту, склад., пер. на беларус. мову : К.С. Аксёнава; аўт. уступ. арт. Н.В. Шаранговіч. – Мінск : Беларус. энцыкл. Імя П. Броўкі, 2013. – 400 с.

3. Эрэнбург, М. Інтанацыя тканага жывапісу / М. Эрэнбург // Мастацтва. – 2011. − №3. – С. 42–45.

4. Эрэнбург, М. Матэрыялы для ідэі / М. Эрэнбург // Мастацтва. – 2012. − №1. − С. 22–23.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ